# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта, 11 лістапада 1999 года, чацвер, № 17 (1809)


ФАКУЛЬТЭТУ ЖУРНАЛІСТЫКІ – 55!

## В.П. ВАРАБ'ЁЎ: "ФАКУЛЬТЭТ АДКАЗНЫ ЗА СТВАРАЛЬНУЮ ІНФАРМАЦЫЙНУЮ ПРАСТОРУ БЕЛАРУСІ..."

*У нас – ува ўсіх, хто мае хоць нейкае дачыненне да журналістыкі – свята. Юбілей журфака. Але да свята яшчэ ёсць колькі часу. Давайце паглядзім, што ж такое журфак сёння. І для гэтага зойдзем у журфакаўскі дэканат, пастукаем у дзверы да Васіля Пятровіча Вараб'ёва. Трохі пачакаем – напярэдадні такога свята да яго прыходзіць шмат наведвальнікаў – і вось, нарэшце...*



**— Васіль Пятровіч, 55 гадоў — многа гэта альбо мала? І на якія думкі наводзіць Вас гэтая дата?**

— Мы можам казаць пра яе сімвалічнасць, яна прыпадае на пералом дзвюх эпох — дваццатага і дваццаць першага стагоддзяў. 55-годдзе — не толькі нагода для святкавання, але і для ўдумлівага аналізу, што зроблена і што не зроблена, які гістарычны шлях прайшоў факультэт і якія перспектывы яго чакаюць. Што чакае ад факультэта чытач, слухач, глядач, грамадства і ў цэлым Беларусь. Бо мы адзіная ў краіне ўстанова, якая рыхтуе спецыялістаў у галіне журналістыкі і камунікацыі. За час свайго існавання факультэт падрыхтаваў амаль 5000 спецыялістаў. Наш калектыў адказвае за стварэнне трывалай інфармацыйнай прасторы ў краіне. Больш таго, ён адказны і за тое, каб інфармацыйны наступ, што лавінай абрынаецца на людзей, успрымаўся адэкватна, каб спажыўцы інфармацыйнай прадукцыі не баяліся інфармацыі. Каб у іх не ўзнікала пачуцця абыякавасці пры знаёмстве з журналісцкімі творамі.

**— Ці забяспечвае журфак поўнасцю беларускія СМІ сваімі навучэнцамі?**

— У рэспубліцы існуе звыш 1000 выданняў, шмат тэле- і радыёстудый. На 90-95% там працуюць студэнты і выпускнікі факультэта журналістыкі. Асноўны цяжар, як бачыце, ляжыць на нашым калектыве.

**— Як збіраецеся святкаваць юбілей?**

— Хачу ізноў падкрэсліць, што хоць у нас і свята, але ж гэта не нагода для таго, каб проста пapляскаць у ладкі. Гэта падстава, каб пагаварыць і пра нашы шматлікія праблемы... Плануем арганізавана правесці святкаванні. 16 лістапада пройдзе Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя на базе Саюза журналістаў Беларусі. 17 лістапада мае быць сустрэча выпускнікоў з сённяшнімі студэнтамі і пасяджэнне Вучонага Савета факультэта — у першай палове дня, і ў другой палове дня — урачыстае пасяджэнне, канцэрт у тэатры імя Янкі Купалы з удзелам студэнтаў, выпускнікоў, запрошаных на свята гасцей. 18 лістапада адбудзецца вялікае святочнае факультэцкае мерапрыемства з пасвячэннем першакурснікаў у студэнты, падвядзеннем вынікаў вераснёўскай студэнцкай практыкі, традыцыйным "капуснікам" і дыскатэкай, каб студэнты маглі адпачыць на сваім свяце. Акрамя таго, мы рыхтуем вельмі шмат сувенірнай прадукцыі: календары, ручкі, нататнікі, фірменныя значкі. Будзе выдадзены даведнік па гісторыі факультэта, каталог навуковых прац выкладчыкаў і г.д.

**— Факультэту штосьці глабальнае да такога свята будзе падаравана?**

— Нам падаравалі галоўнае — мару. Мару пра новы будынак па вуліцы Кальварыйскай. І самая вялікая ўрачыстасць і радасць была б, каб на свяце нам уручылі ключ, хаця б сімвалічны. Гэта было б на сённяшні дзень здзяйсненнем мараў. Але пакуль што размова ідзе толькі пра 2000—2001 гады. Я думаю, што сёлетнія трэцякурснікі маюць шанцы павучыцца ў родным журфакаўскім доме.

*__Рэмарка:__ Калі ў нечым іншым пажаданні і мары студэнтаў разыходзяцца з марамі дэкана, дык тут яны супадаюць цалкам. Яшчэ год таму журфакаўцы-студэнты мроілі пра тое амаль міфічнае кальварыйскае збудаванне і нават наважыліся ды схадзілі на тое святое месца ў паломніцтва. Унутр іх не прапусцілі. Але ж, па чутках, будаўніцтва зрушылася з мёртвай кропкі. Хутчэй бы туды.*

**— Якім уступае факультэт у новае тысячагоддзе?**

— У цалкам абноўленым, мадэрнізаваным выглядзе. Зараз мы перайшлі на новы вучэбны план, абнавілі дысцыпліны, увялі шмат новых курсаў — тых, якія звязаны непасрэдна з прафесійнай дзейнасцю журналіста: дысцыпліны сацыяльна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, сацыяльна-псіхалагічнага профілю. Не будзем змяншаць пры гэтым філалагічную падрыхтоўку. Вырас колькасна сам факультэт: зараз у нас амаль 1000 студэнтаў на ўсіх формах навучання, працуе каля 100 кваліфікаваных выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Тэхнічна аснасціліся. Па сутнасці, у кожнай рэдакцыі найбольш

(Заканчэнне на 2-й стар.)

### АБ'ЯВЫ

**Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**Загадчыкаў кафедраў:** сістэмнага аналізу, канстытуцыйнага права;

**Прафесараў кафедраў:** тэарэтычнай фізікі;

**Дацэнтаў кафедраў:** сістэмнага аналізу, фізікі, фізічнай электронікі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, гісторыі беларускай літаратуры, замежнай літаратуры, крыніцазнаўства і музеязнаўства, філасофіі і метадалогіі навукі, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, крымінальнага права;

**Старшых выкладчыкаў кафедраў:** гісторыі філасофіі і культуры, кібернетыкі, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, фізічнага выхавання і спорту, сучаснай беларускай мовы, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры;

**Выкладчыкаў кафедраў:** філасофіі і метадалогіі навукі, сацыялогіі, раманскіх моў, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, фізічнага выхавання і спорту.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, Белдзяржуніверсітэт, Упраўленне кадраў, тэл. 226-59-39.

# В.П. ВАРАБ'ЁЎ: "ФАКУЛЬТЭТ АДКАЗНЫ ЗА СТВАРАЛЬНУЮ ІНФАРМАЦЫЙНУЮ ПРАСТОРУ БЕЛАРУСІ..."

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

вядомых, аўтарытэтных выданняў створаны філіялы кафедраў, дзе журналісты займаюцца з нашымі студэнтамі.

*Рэмарка: Намаганнямі У.М. Ладуцькі на журфаку ўжо абсталявана добрая фоталабараторыя. Ёсць нават задума стварыць на яе базе універсітэцкае фотаагенцтва. Існуе вучэбная радыёстудыя, сучасная апаратура ў якой самая што ні на ёсць прафесіянальная, а не вучэбная. Побач — клас мультымедыя, рэдакцыйна-выдавецкі комплекс...*

Да таго ж, улетку на факультэце пасля доўгіх абяцанак нарэшце з'явіўся славуты Інтэрнэт. Спадзяемся, што ў хуткім часе кожны студэнт будзе мець да яго свабодны доступ.

**— Існуе думка, што выкладчыцкія кадры факультэта складаюць пераважна людзі, якія не знайшлі сваё месца ў журналістыцы.**

— Гэта абсалютная недарэчнасць. Ну як можна назваць няўдалай журналісцкую кар'еру Барыса Стральцова ці Таццяны Арловай, Аляксандра Акуліка ці Аляксандра Класкоўскага, Андрэя Патрэбіна ці Міхаіла Міхаевіча, Людмілы Рыжанковай, Аляксандра Карлюкевіча... І каго ні вазьмі з выкладчыкаў — усе па 5-10 год адпрацавалі ў вядучых выданнях рэспублікі.

*Рэмарка: Тут трэба сказаць, што сярод гэтых славутых беларускіх журналістаў Васіль Пятровіч не назваў сябе. Натуральна, яму было б няёмка хваліць самога сябе падчас нашай гутаркі. А між іншым, ад выкладчыкаў журфака абавязкова патрабуюцца іх асабістыя рэгулярныя публікацыі ў прэсе. Дэкан факультэта Васіль Пятровіч Вараб'ёў у гэтым сэнсе не выключэнне: ён прайшоў усе кругі журналісцкага пекла ад практыканта ў раёнцы да рэдактара газеты. Сем год рэдагаваў «Беларускі універсітэт». У свой час ён стаў самым маладым кандыдатам навук на факультэце і ўжо ў 33 гады загадваў кафедрай тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі. Пяць гадоў узначальваў Упраўленне інфармацыі Вярхоўнага Савета Беларусі.*

**— Якія прыярытэты і планы зараз у факультэта?**

— Прыярытэты ў нас традыцыйныя. Па-першае, кожны студэнт павінен атрымаць класічную універсітэцкую адукацыю і, па-другое, набыць моцныя прафесійныя веды. Каб студэнт не толькі выйшаў ад нас з дыпломам, але каб прыйшоў у рэдакцыю газеты, на радыё ці тэлебачанне падрыхтаваным да гэтай працы. Будзем надаваць вялікае значэнне практыцы студэнтаў.

**— Якія арганізацыі за мяжой напрамую кантактуюць з факультэтам журналістыкі?**

— У нас ёсць кантакт са многімі універсітэтамі Еўропы. Так, добрыя сувязі ўсталяваліся з Берлінскім універсітэтам, з Марсэльскім універсітэтам, з Грэнобльскім інстытутам камунікацыі. Падтрымліваем сувязі са шведскімі даследчыкамі журналістыкі. Літаральна восьь гэтымі днямі вялікая група нашых выкладчыкаў вярнулася з двухтыднёвай стажыроўкі ў Швецыі. Такім чынам, мы імкнемся не замыкацца ў сваёй шкарлупіне.

*Рэмарка: І гэта праўда. Часам сядзіш у факультэцкай бібліятэцы, варушыш падшыўку "Прэсбола" ці "Звязды" — адчыняюцца раптам дзверы, і чуецца голас перакладчыка, нешта кшталту "It's our faculty library. For students..." І спагадлівыя шведы згодна ківаюць галавой: маўляў, гуд, добрая бібліятэка, добрыя студэнты.*

*А можна проста зранку прыйсці на факультэт, нічога не падазраючы, і даведацца, што сёння дзве першыя пары ў нас на трэцім курсе будзе чытаць прафесар амерыканскага універсітэта. Прыемныя такія неспадзяванкі.*

*Але ж давайце закранем лепш яшчэ адну факультэцкую праблему.*

**— Як будзе развівацца далейшы сцэнарый з засяленнем іншагародніх студэнтаў?**

— Сапраўды, у гэтым годзе мы трапілі ў цяжкае становішча з засяленнем іншагародніх студэнтаў журфака. Зараз маем дзесьці 190 месцаў у інтэрнаце. А нам трэба больш за 250. Таму просім рэктарат, просім іншыя факультэты дапамагчы. Справа ў тым, што на журфак заўсёды паступае найбольшая сярод усіх факультэтаў колькасць маладых людзей з іншых гарадоў.

*Рэмарка: Праблема засялення тычыцца не толькі аднаго журфака, але ж наогул усяго універсітэта. Паводле вераснёўскіх звестак, з прыкладна 5000 іншагародніх студэнтаў БДУ амаль 1000 не знайшла сабе месца ва універсітэцкіх інтэрнатах. Гэта здарылася з-за таго, што інтэрнаты № 1 і № 6 знаходзяцца на капітальным рамонце. Праз гэта шмат каму давялося "патрэсці" сваіх бацькоў і адшукаць сабе новую кватэру. Хтосьці, праўда, зарабляе на яе сам. Студэнтам давядзецца патрываць і прадэманстраваць стойкасць у барацьбе з жыццёвымі (ці лепш — жыллёвымі?) падножкамі. Студэнт павінен, паводле вызначэння, быць моцным.*

**— Што Вы як дэкан цэніце ў студэнце?**

— Цікаўнасць і творчы падыход. Не толькі да працы і вучобы, але і да ўсяго жыцця. Аднаго не магу дараваць студэнту — няшчырасці. А наогул, я прапагандую і практыкую самую непасрэдную форму зносін са студэнтамі.

**— Вы ў свой час былі самым маладым рэдактарам газеты «Беларускі універсітэт». Што Вам цяжэй — журналісцкая практыка альбо праца дэкана на такім свабодалюбівым факультэце?**

— Па кожным часе свае песні... Ведаеце, свае цяжкасці ёсць і там, і там. Але без дзесяцігадовай практыкі не было б зараз і дэканства. Хаця былі і ёсць выключэнні. Ал гэта толькі выключэнні, а не правілы.

**— Ці шкадавалі Вы калі-небудзь, што звязалі жыццё з журналістыкай?**

— Ніколі. Хоць былі і вельмі цяжкія часы. Але ж журналістыка — гэта перспектыўна. Гэта не толькі шанц прынесці карысць грамадству, але ж і магчымасць увасобіць свае мары.

**— Што б Вы хацелі сёння пажадаць свайму факультэту?**

— Хацелася б, каб калектыў факультэта: студэнты, выкладчыкі, лабаранты, — святкуючы 55-годдзе, думалі пра тое, што мы павінны ўвайсці ў дваццаць першае стагоддзе як мага больш падрыхтаваныя як у арганізацыйным, так і ў змястоўным плане. Каб мы пазбавіліся тых хібаў, якія заміналі нам рыхтаваць добрых спецыялістаў.

*Рэмарка: Дзякуй вялікі, Васіль Пятровіч! А наша рэдакцыя, са свайго боку, далучаецца да ўсіх віншаванняў, што атрымае журфак-55, і жадае, каб усе мары студэнтаў, выкладчыкаў і выпускнікоў факультэта здзейсніліся.*

*Уладзімір СТАТКЕВІЧ*



# ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫЯ ГУЛЬНІ

Напрыканцы кастрычніка ў Мінску на базе Белдзяржуніверсітэта адбыліся II чвэрцьфінальныя спаборніцтвы каманднага чэмпіяната свету па праграмаванні сярод студэнтаў. Заяўкі на ўдзел у спаборніцтвах паступілі ад 26 каманд буйнейшых універсітэтаў і інстытутаў Беларусі і Эстоніі. Было зарэгістравана 24 каманды з Брэста, Гомеля, Гродна, Мозыра, Магілёва, Мінска, а таксама універсітэцкая каманда з горада Тарту (Эстонія).

Як паведаміла Людміла Уладзіміраўна Пеўзнер, дацэнт кафедры матэматычнага забеспячэння ЭВМ, дырэктар спаборніцтваў Заходняга рэгіёну, камандам было прапанавана 6 задач, якія неабходна было рашыць за 5 гадзін. Тэсціраванне адбывалася аўтаматычна пры дапамозе спецыяльнай тэсціруючай сістэмы, распрацаванай на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ. Удзельнікі і кіраўнікі каманд маглі назіраць за ходам спаборніцтваў па спецыяльнай табліцы.

На паўфінальныя спаборніцтвы ў Санкт-Пецярбург, якія адбудуцца ў канцы лістапада гэтага года, былі рэкамендаваны каманды Белдзяржуніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага універсітэта транспарта, універсітэта з Тарту, Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта, Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта.

Камандныя спаборніцтвы па праграмаванні сярод студэнтаў падтрымліваюцца міжнароднай арганізацыяй Association for Computer Machinery (ACM), якая з'яўляецца найбольш аўтарытэтнай у галіне камп'ютэраў. Штогод вясной ACM праводзіць фінал каманднага чэмпіяната свету па праграмаванні сярод студэнтаў, пераможцы якога ўзнагароджваюцца разам з лаўрэатамі разнастайных навуковых прэмій на традыцыйным штогадовым урачыстым сходзе. Каманды-пераможцы рэгіянальных груп выходзяць у фінал і разыгрываюць званне чэмпіёна свету, Еўропы, Паўночнай Амерыкі і іншых кантынентаў.

Па словах Людмілы Уладзіміраўны, па першы погляд здаецца, што гэтыя спаборніцтвы адносяцца да галіны "высокага чыстага мастацтва", якое мае зусім мала агульнага з рэальнасцю. Аднак вынікі гэтых інтэлектуальных гульняў сусветнай праграмісцкай эліты выклікаюць цікавасць ужо для значна больш шырокіх колаў, таму што працэс фарміравання і падрыхтоўкі каманд грунтуецца на ўсёй адукацыйнай, навуковай, прамысловай, культурнай інфраструктуры гэтай краіны.

Камандны чэмпіянат свету сярод студэнтаў праводзіцца ACM, пачынаючы з 1977 года. Беларуская каманды пачалі прымаць удзел толькі з 1995/1996 гадоў. У 1999 годзе каманда Белдзяржуніверсітэта ўпершыню заваявала права на ўдзел у фінальных спаборніцтвах у Галандыі, дзе паспяхова выступіла. Спонсарамі каманды БДУ у гэтай паездцы былі Белдзяржуніверсітэт, сумеснае прадпрыемства IBA — партнёр па сумесных праектах, дыстрыб'ютар карпарацыі IBM і кампанія Атлант-М.

Будзем спадзявацца, што каманды нашага універсітэта пакажуць высокія вынікі на паўфінальных спаборніцтвах 22—24 лістапада ў Санкт-Пецярбурзе і прымуць удзел у фінале 1999/2000 гадоў у ЗША.

*Юлія ШЧАРБАКОВА*

# НА КРЫЛАХ ЖУРФАКА – ДЗВЕ «ПЯЦЁРКІ»

Пяцьдзесят пяць гадоў будуе інфармацыйную прастору Беларусі факультэт журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Пяцьдзесят пяць гадоў творчая Alma-mater нарошчвае інфармацыйную культуру беларуса, грамадства, дзяржавы. Пяцьдзесят пяць гадоў журфак набліжае наступленне «трэцяй хвалі» цывілізацыі — інфармацыйнай, якую футуролагі звязваюць з пачаткам XXI стагоддзя.

Па акадэмічнай шкале каштоўнасцей гэтыя рэфрэнныя дзве «пяцёркі» не толькі сімвалізуюць, але і ўвасабляюць выдатны гістарычны шлях і выдатныя перспектывы журфака БДУ.

Створаны ў віхуры вызваленчай барацьбы Беларусі супраць гітлераўскіх захопнікаў, факультэт журналістыкі як удзячны сын свайго народа дапамагае людзям, грамадству трымаць інфармацыйны фронт.

Ніколі ў мінулым перад журналістам не стаяла задача такога старраннага адбору інфармацыі, яе аб'ектыўнага аналізу і апрацоўкі. Інфармацыйны наступ настолькі моцны, што ў радавых спажыўцоў выпрацоўваецца абарончая рэакцыя абыякавасці і раздражнення. Без кваліфікаванага ўдзелу журналіста, спецыяліста па камунікацыі інфармацыя перастае выконваць галоўную ролю — зніжаць бар'ер няпэўнасці. Больш таго — паграўжае захліснуць чытача, слухача, гледача. Журфак падрыхтаваў звыш 5 тысяч спецыялістаў, якія прафесійна і кваліфікавана думаюць пра людзей, што стаміліся ад інфармацыі. Больш пачэсную і адказную місію наўрад ці знойдзеш!

Факультэт журналістыкі імкнецца ўдасканальвацца, каб заставацца лепшым. Усведамляючы нарастаючыя выклікі часу, калектыў паступальна рэалізуе праграму «Журфак на парозе XXI стагоддзя». Яна распрацавана ў адказ на вядомую прапанову 1996 года аб рэарганізацыі журналісцкай адукацыі ў краіне.

Новая акадэмічная палітыка, якую ажыццяўляе журфак напрыканцы XX стагоддзя, заключаецца ў далейшым развіцці традыцыйна высокай фундаментальнай падрыхтоўкі, ва ўмацаванні трывалых творчых сувязей са сродкамі масавай інфармацыі.

Дзеля гэтага ў 1998 годзе кардынальным чынам трансфарміраваны пяцігадовы вучэбны план і адпаведныя рабочыя планы. Журналісцкія будні і навуковы пошук падказалі шлях насычэння класічнага універсітэцкага навучання журналістаў дысцыплінамі сацыяльна-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, сацыяльна-псіхалагічнага, прававога, тэхналагічнага профілю, збалансаванага з філалагічнай і гістарычнай падрыхтоўкай. Бо, па меркаванні практыкаў, вучоных, менавіта колішняя недасканаласць навучання студэнтаў працэсам збору, апрацоўкі, асэнсавання і інтэрпрэтацыі інфармацыі, а таксама эксплуатацыя інтуітыўна-сузіральных метадаў назапашвання фактаў сілкуе рамесніцка- доследную плынь прэсы.

Шэраг сацыяльных, прававых і тэхналагічных дысцыплін, уведзеных у вучэбны план, скіраваны на выхаванне ў пачынаючых журналістаў трывалых навыкаў аб'ектывацыі фактаў жыцця з палітычным, эканамічным, псіхалагічным кантэкстам рэчаіснасці.

Вопыт сведчыць, што альтэрнатыва рамесніцка-доследнай мадэлі прэсы знаходзіцца ў рэчышчы сацыялагізацыі журналістыкі. Выйсце крыецца ў рэальным выкарыстанні ў штодзённай рэдакцыйнай практыцы не толькі сігнальных, але колькасных і якасных паказчыкаў рэчаіснасці. Намаганні выкладчыкаў сёння скіраваны на тое, каб ужо за студэнцкай партай маладыя людзі імкнуліся да журналістыкі з моцным інтэлектуальным, кантэкстуальным падыходам. І студэнты хінуцца да такой журналістыкі, жадаюць стаць летапісцамі рэчаіснасці, а не сучаснасці ў сіюмінутным вымярэнні.

Падрыхтоўка да журналісцкай дзейнасці ў рэальных рэдакцыйных умовах — такі напрамак рэфармавання вучэбнага працэсу на факультэце. Літаральна на кожнай спецыяльнай дысцыпліне студэнты імкнуцца авалодваць не толькі тэарэтычнымі ведамі, але і ўвасабляюць іх у матэрыялы газет і часопісаў, перадачы радыё і тэлебачання. Скразны курс «Журналісцкага майстэрства», занятві па 17 профілях у творчых майстэрнях інтэгруюць і замацоўваюць практычны аспект універсітэцкага сталення.

Цалкам лагічным і неабходным крокам стала вызначэнне статусу практыкі як выключна важнай, першаснай дысцыпліны на факультэце. У час вучобы студэнты праходзяць вучэбна-азнаямляльную, дзве вытворчыя і пераддыпломную практыку.

Цяпер практыка студэнтаў арганічна ўключана ў вучэбны працэс. Перанесены тэрміны яе праходжання. Штогод у верасні студэнцтва шчырэе ў рэдакцыях газет, у калектывах радыё і тэлебачання, рэкламных агенцтваў і прэс-службаў. Ініцыятыўныя, прагныя да штодзённай творчасці юнакі і дзяўчаты маюць магчымасць супрацоўніцтва ў ліпені-жніўні з рэдакцыямі газет, радыё, тэлебачання па ўласным жаданні. Творчая справаздача аб практычнай падрыхтоўцы да прафесійнай дзейнасці цяпер стаіць першым пытаннем у білеце на дзяржэкзамене ў пяцікурснікаў.

Такі падыход да навучання журналістаў выбраны дэканатам і Вучоным Саветам факультэта. Першыя яго выпрабаванні жыццём пацвердзілі слушнасць зробленых крокаў. Падставай для такога меркавання служаць справаздачы аб практыцы, водгукі рэдакцыйных калектываў. Творчыя партфелі многіх студэнтаў абнадзейваюць, што чакаюцца плённыя вынікі ў большасці журфакаўцаў. Хаця перасцярог ад «ломкі планаў» як было дастаткова, так і не ўсе яны адхілены сёння.

Паралельна са студэнцкай практыкай факультэт арганізаваў штогадовую творчую стажыроўку ўсіх выкладчыкаў у СМІ. Радуе, што старэйшыя калегі ўзнавілі ў памяці рэдакцыйныя будні. Многія актыўна падзяліліся сваім публіцыстычным роздумам з чытачамі, слухачамі, гледачамі.

Журфак можа і павінен зрабіць новы прарыў у акадэмічнай дзейнасці, выкарыстоўваючы сучасныя сусветныя дасягненні ў тэхналогіях навучання, у мадэрнізацыі адукацыйных праграм, камп'ютэрных і інфармацыйных тэхналогіях.

Гэтая ўпэўненасць выклікана тым, што калектыў журфака, абапіраючыся на вопыт старэйшага пакалення выкладчыкаў, актыўна далучае да педагагічнай дзейнасці журналістаў-практыкаў. У калектыве працуюць 6 дактароў навук, прафесараў, 32 дацэнты, кандыдаты навук, 3 прафесары носяць ганаровае званне — «Заслужаны работнік...». Мара пра сплаў, баланс тэорыі і практыкі ў вучэбным працэсе ўвасабляецца сёння «звяздоўцамі» М.В. Міхаевічам, Л.І. Рыжанковай, У.У. Андрыевічам, «рэспубліканцамі» А.К. Акулікам і А.У. Патрэбіным, А.У. Класкоўскім і Л.Ф. Курганові з «Народнай газеты», А.М. Карлюкевічам з «Чырвонай змены», І.К. Андрэевай з «Мінскай праўды», Л.І. Перагудавай (часопіс «На экранах»), Л.П. Беляковай з «Белорусской нивы», Я.І. Дзмітрыевым (АТН), Г.Б. Багданавай (часопіс «Мастацтва»), Б.А. Крапакам («Культура»), З.А. Бандарэнка, В.А. Радуцкім, В.П. Субатам, В.В. Харытонавым, А.М. Дамарацкім, Л.І. Мельнікавай, А.А. Шаўко з тэлерадыёкампаніі і інш.

Па сутнасці, у Доме прэсы з дапамогай Дзяржкамдруку Беларусі, у Нацыянальнай Дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, Нацыянальным прэсцэнтры створаны філіялы факультэцкіх спецыялізаваных кафедраў — творчыя лабараторыі журналісцкага майстэрства. Многія студэнты-старшакурснікі на роўных з вядомымі майстрамі слова працуюць у штаце рэдакцый. У выніку змоўклі ціхія папрокі ў адрас факультэта, якія не раз гучалі ў рэдакцыйных калідорах з вуснаў не вельмі дыпламатычных і дбайных калег. Бо вучым жа заўраз усе разам, талакой. Кожны, хто думае пра будучыню сваёй рэдакцыі, падстаўляе плячо. Гэты рух удзельнікаў падрыхтоўкі журналістаў шырыцца.

Трансфармацыя зместу і падыходаў да навучання будучых журналістаў, работнікаў іншых прафесій інфармацыйнай галіны запатрабавалі і карэнных структурных зменаў. Факультэт штогод у апошні час адкрывае новыя спецыяльнасці. Таленавітая і творчая моладзь Беларусі сёння мае магчымасць выбіраць па свайму густу і здольнасцях спецыяльнасці «журналістыка» ці «міжнародная журналістыка», «інфармацыя і камунікацыя» ці «літаратурная работа».

Мадэрнізацыя факультэта, новыя задачы, якія паставіў час перад калектывам, далі магчымасць правесці дыферэнцыяцыю і павялічыць колькасць кафедраў як цэнтраў навуковай, вучэбнай, метадычнай і выхаваўчай работы: з пяці — да васьмі. У 1998 годзе створаны кафедры перыядычнага друку, сацыялогіі журналістыкі, літаратурна-мастацкай крытыкі, а ў 1999 — кафедра тэхналогій камунікацыі. На чарзе — арганізацыя кафедры замежных моў.

Адчуваючы вострую неабходнасць паляпшэння тэхналагічнай і тэхнічнай узброенасці сучаснага журналіста, факультэт стварыў Вучэбны цэнтр камунікацыйных тэхналогій, у састаў якога ўваходзяць лабараторыі: фотажурналістыкі, выдавецкая, інфарматыкі і мультымедыя, аўдыёвізуальная. Лабараторыі абсталяваны найноўшай камп'ютэрнай тэхнікай. Зроблены пэўныя крокі па стварэнні радыёстанцыі «Радыё БДУ», дзе будуць шліфаваць свае здольнасці журфакаўцы.

Гэта — толькі некаторыя штрыхі да партрэта журфака БДУ. Сённяшнія захады па трансфармацыі і мадэрнізацыі сістэмы падрыхтоўкі на журфаку ўяўляюцца дзейсным фактарам устойлівага цывілізацыйнага развіцця беларускай журналістыкі ў наступным тысячагоддзі.

Маючы за плячыма 55 гадоў плённай працы, стварыўшы самы буйны творчы Саюз журналістаў, падсілкаваўшы сваімі выхаванцамі значную частку Саюза пісьменнікаў, забяспечыўшы «залатымі пёрамі» большасць з сённяшніх 1100 перыядычных выданняў, тэлерадыёкампанію, шматлікія тэлестудыі і радыёстанцыі, прэс-цэнтры і прэс-службы, рэкламныя агенцтвы і службы па сувязях з грамадскасцю, журфак на парозе XXI стагоддзя адчувае сябе бадзёрым, энергічным, нацэленым на перспектыву. Зразумела, нявырашаных пытанняў — шмат, вузкіх месцаў — хапае. Адна з праблем, напрыклад, — слабы прыток маладых кандыдатаў, дактароў навук. Нават нядаўна адноўленая пасля працяглага перапынку праца Савета па абароне дысертацый кардынальна не змяніла трывожную сітуацыю.

Аднак верыцца, дзве пяцёркі на крылах журфака, нібы выдатныя адзнакі ў студэнцкай залікоўцы, змогуць натхніць і дапамогуць пераадолець усе цяжкасці на шляху стваральнай дзейнасці творчага факультэта. Бо дзве пяцёркі — гэта толькі пачатак. Іх будзе значна больш. Абавязкова будзе!

Са святам, родны факультэт! З 55-м днём нараджэння калектыву, паважаныя калегі!

*В.П. ВАРАБ'ЁЎ,*
*дэкан факультэта журналістыкі*

# Пра сябе і пра факультэт

**Ефрасіння Леанідаўна БОНДАРАВА,** прафесар кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі, доктар філалагічных навук, Заслужаны дзеяч навук, аўтар многіх кніг, вучэбных дапаможнікаў, артыкулаў, рэцэнзій, творчых партрэтаў, кінакрытык:

— Пазнаёмілася з факультэтам у красавіку 1945 года, калі прыехала ў Мінск на першы пасляваенны агляд самадзейнасці. Ехала ў сталіцу з намерам застацца на вучобу. Да вайны вучылася ў Ленінградзе, але ж па вядомых прычынах прыйшлося перарваць вучобу. Адразу пасля вайны вучыцца было нялёгка. Амаль не было падручнікаў. Выкладчыкі працавалі па гадзінах і часта мяняліся. Матэрыялаў не было, распрацоўваць тэмы не хапала часу, вось прыйдзе выкладчык раз-другі, скончыцца ў яго матэрыял, і пойдзе. Хаця ў нас саміх, у мяне ды і ў іншых студэнтаў таго часу, быў свой уласны вопыт — з восені 1943 г. па вясну 1945 г. я працавала ў Лёзненскай раённай газеце на Віцебшчыне, і была там, як кажуць, «і краўцом, і шаўцом». Здзіўляла ў той час тая апантанасць, што была ў студэнтаў: разруха, голад, страта блізкіх і каханых, а ў людзей — прага да ведаў. У нас не было свайго будынка, таму займаліся ў школах. Адна з іх — каля Нацыянальнай бібліятэкі. Памятаю, як мы збягалі з апошніх лекцый у тэатр імя Янкі Купалы і Дом афіцэраў, дзе выступалі артысты оперы. Было ў мяне яшчэ адно захапленне: кіно. У той час я ўжо працавала на рэспубліканскім радыё і мела магчымасць дастаць білет у адзіны кінатэатр Мінска. Ён так і называўся — «Першы». Там дэманстраваліся трафейныя фільмы, і проста так узяць білет было вельмі складана. Жылі як і ўсе. Таксама, як і сённяшняя моладзь, кахалі, бегалі на танцы. Памятаю, як Рыгор Васільевіч Булацкі, будучы дэкан, граў на акардыёне, а Міхась Яўгенавіч Цікоцкі на піяніна, выконвалі салдацкія песні.

Вучылася я добра. Выдатніцай не была, але і троек у мяне не было. Лічу, што атрымліваць тройкі — ніжэй годнасці студэнта. Галоўнае для студэнта — мець веды, сваю канцэпцыю і абараняць яе.

Пасля заканчэння запрасілі ў аспірантуру, і паралельна працавала ў Міністэрстве кінематаграфіі галоўным рэдактарам па вытворчасці фільмаў. Мне вельмі падабалася мая праца. Галоўны абавязак мой быў: чытаць сцэнарыі, складаць рэкамендацыі, бываць на здымках фільмаў, пісаць заключэнні на тыя фільмы, што былі завершаныя. Але займалася амаль усім. Цікавілася нават укладкай тэксту для дубліравання. А гэта вельмі складаная справа. Мала проста перавесці тэкст, трэба зрабіць так, каб новыя словы герояў падыходзілі пад рухі губ.

Пасля заканчэння аспірантуры Марк Саламонавіч Зярніцкі, выконваючы абавязкі дэкана, запрасіў мяне чытаць “нешта пра кіно”. Вось так я і прыйшла ва універсітэт як выкладчык. З аднаго боку, працаваць мне было лёгка, бо ў Міністэрстве працэс стварэння кіно бачыла сваімі вачыма. А з другога — складана, бо не было ніякай літаратуры. Таму прыйшлося распрацоўваць курс самой.

Цікава было працаваць са студэнтамі. Яны вучыліся, і я разам з імі. З некаторымі было асабліва цікава. Анатоль Вярцінскі прызнаўся, каб не было альманахаў, якія мы выпускалі пасля заняткаў, ён, мабыць, і не застаўся б у паэзіі. Іван Пташнікаў гаварыў, што яго літаратурная дзейнасць пачалася з таго занятку, дзе студэнты пісалі рэцэнзіі ці кароткія апавяданні. Мне яго праца спадабалася, параіла яму зайсці ў рэдакцыю “Маладосці”. Так з’явілася ўпершыню прозвішча цяпер вельмі грунтоўнага пісьменніка Івана Пташнікава.

Вельмі важна размаўляць са студэнтам як з творчай асобай. Мне не цікава працаваць з людзьмі, якія могуць толькі знайсці факт ды яшчэ падсмажыць яго, як любяць у жоўтай прэсе. Журналіст павінен думаць. І мы, выкладчыкі, павінны знайсці тую сцяжынку, якая вядзе да Асобы.

**Вячаслаў Рыгоравіч БУЛАЦКІ,** загадчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання, дацэнт, кандыдат гістарычных навук:

— Як выкладчык я прыйшоў на факультэт у 1980 годзе пасля аспірантуры. Знешне за гэтыя дваццаць год мала што змянілася. Усё той жа будынак, усё тыя ж знаёмыя твары. А напаўненне факультэта стала іншым. Факультэт пашыраецца, ідзе ў нагу з часам. З’явіліся новыя праграмы, новыя спецкурсы, новае абсталяванне. Я толькі прыехаў з камандзіроўкі ў Швецыю, дзе наведваў Кальнарскі універсітэт. Так абсталяванне нашага факультэта кафедры радыё і тэлебачання няшмат саступае шведскаму. А нашы студэнты вельмі змяніліся за гэтыя гады. Зараз хлопцы і дзяўчаты больш вольныя, незалежныя ў сваіх думках, падрыхтаваныя ў сферы сучаснай камунікацыі. Але ў той жа час, мне здаецца, узровень адукацыі большай часткі моладзі не такі высокі, як раней. Магчыма, гэта атрымліваецца таму, што цяперашнія старшакласнікі і студэнты не вельмі сябруюць з кнігай.

Калі ўспамінаць самыя важныя падзеі, то ў жыцці факультэта гэта, мабыць, была перабудова, калі прыходзілася пераглядаць не толькі навучальныя праграмы, але і погляды на журналістыку наогул. А для сябе асабіста лічу вельмі важным той дзень, калі ўзначаліў кафедру тэлебачання і радыё. Гэта вельмі вялікая адказнасць. Пад маім кіраўніцтвам працуюць мае былыя выкладчыкі. І вельмі важна іх вопыт, традыцыі, якія яны стваралі, злучыць з новымі патрабаваннямі часу.

**Віталь Рамуальдавіч ВАШКЕВІЧ,** выконваючы абавязкі загадчыка кафедры тэхналогій каммунікацыі, дацэнт, кандыдат філалагічных навук:

— У 80-м годзе, калі я прыйшоў на факультэт студэнтам-першакурснікам, журфак меў два дома: наш цяперашні будынак па вуліцы Маскоўскай і будынак на Свярдлова. Сярод нас вучылася шмат замежных студэнтаў. Калі гаварыць пра працэнтныя суадносіны — гэта прыкладна 50/50. На кафедры тэлебачання і радыёвяшчання апаратура гадоў шасцідзесятых. Пасля з’явілася каляровая тэлестудыя, але таксама далека не самая лепшая. А зараз на факультэце няма ніводнай кінакамеры, толькі відэа. Не маем мы і тэлестудыі. Адна надзея на новы будынак па вуліцы Кальварыйскай. Зусім нядаўна займелі выхад у Інтэрнэт. Але, на жаль, у рэспубліцы амаль не рыхтуюць спецыялістаў для працы ў Інтэрнэт. На нашай кафедры ёсць спецыялізацыя па гэтай спецыяльнасці, але дзесяць чалавек становішча не выправяць. Чамусьці лічыцца, што Інтэрнэт — прывілея камп’ютэршчыкаў, а значыць, факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі. Падрыхтоўкай тэкстаў у шырокім сэнсе: фота, малюнак, відэа, гук, — павінны займацца гуманітарыі, а ўносіць яго на старонкі — камп’ютэршчыкі.

*Вольга КУЛІКОВА,*
*студэнтка 5-га курса факультэта журналістыкі*

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

# “Чарнобыльскі бусел” ляціць на дапамогу

Сёлета ўпершыню па ініцыятыве Савета жанчын Белдзяржуніверсітэта праводзілася святкаванне дня Маці, якое суправаджалася выставай творчых выбараў выкладчыкаў БДУ і іх дзяцей. Па прапанове прафкама студэнтаў БДУ сваю экспазіцыю вырашыла прадставіць дабрачыннае грамадскае аб’яднанне “Чарнобыльскі бусел”. Гэта арганізацыя, кіраўніком якой, дарэчы, з’яўляецца таксама жанчына і маці Наталля Мікалаеўна Барукава, ў бягучым годзе адзначае сваё трохгоддзе. Шмат дабрачынных акцый было праведзена аб’яднаннем за час свайго існавання: гэта і выдача гуманітарнай дапамогі незабяспечаным сем’ям, і арганізацыя Навагодняга балю для дзяцей, а таксама выезд іх за мяжу на аздараўленне і інш. Усяго за тры гады “Чарнобыльскі бусел” здолеў перарасці з мала каму вядомага незалежнага фонду дапамогі дзецям, пацярпелым ад аварыі на ЧАЭС, у аб’яднанне з добрай рэпутацыяй і шматлікімі накірункамі дзейнасці. Аб адным з іх — супрацоўніцтве з прафкамам студэнтаў БДУ, Наталля Мікалаеўна сказала наступнае:

— У наш час цяжка жыць большасці насельніцтва. Аднак студэнтам, асабліва тым, хто мае патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы, інвалідам, сіратам, сямейным парам, мабыць, цяжэй удвая. Таму я лічу неабходнай справай выкарыстаць невялікія сродкі аб’яднання для паляпшэння дабрабыту гэтай катэгорыі студэнтаў.

У планы “Чарнобыльскага бусла” сёлета было ўключана атрыманне студэнтамі гуманітарнай дапамогі ў рамках штогодняй акцыі “Зімовы клопат”. Разам з прафкамам студэнтаў распрацоўваюцца праекты дабрачынных мерапрыемстваў падчас навагодніх святаў.

Планаў шмат, аднак іх ажыццяўленне напрамую залежыць ад зацікаўленасці універсітэцкай адміністрацыі, нашай з вамі ініцыятывы, а таксама ад падтрымкі спонсараў. Аб’яднанне з радасцю дапаможа апошнім рэалізаваць сябе ў сферы дабрачыннасці.

Адрас ДГА “Чарнобыльскі бусел”: праспект Ф. Скарыны, 78, тэл. 266-36-20, тэл. прафкама студэнтаў БДУ 226-59-57.

*Віталь МІЧКОЎ,*
*член сацыяльнай камісіі студэнцкага прафкама БДУ*

А Ў НАС! А Ў ВАС?

# Пасвячэнне – вясёлы крок у сур'ёзнае жыццё

*У чацвер, 28 кастрычніка, на геаграфічным факультэце ладзілася пасвячэнне першакурснікаў у студэнты. І ўжо традыцыйна праводзілася яно прымеркаваным да дня БДУ.*

А шостай гадзіне ўдзельнікаў свята ўжо чакала падрыхтаваная загадзя паласа перашкод. У яе пачатку ўсім першакурснікам выдавалі імянныя "залікоўкі" паласы, запісвалі прозвішча і накіроўвалі далей.

На першым пікеце іх чакала гульня ў крыжыкі-нолікі, вядомая яшчэ са школьных часоў. Пасля такой своеасаблівай размінкі першакурснікі накіроўваліся далей, да больш цяжкіх выпрабаванняў. На мяжы першага і другога паверхаў быў наладжаны новы пікет, прайсці які было ўжо некалькі складаней, бо патрэбна было падчас узняцця на новую прыступку лесвіцы называць што-небудзь з геаграфічнай наменклатуры прапанаванай часткі свету. Аднак для геаграфаў гэта цяжкасцей таксама амаль не складала.

Яшчэ больш ускладнялася заданне на трэцім пікеце. Прапанаваліся дванаццаць лічбаў рознага колеру, якія патрэбна было запомніць, пасля чаго задаваліся розныя каверзныя пытанні. Напрыклад, патрэбна было назваць сярэднюю з табліцы ці ўспомніць, колькі сініх лічбаў было на табло. Атрымаўшы (ці не атрымаўшы) адзнаку аб выніковым праходжанні гэтага пікету, першакурснікі ішлі далей, да наступнага пікету, дзе павінны былі праявіць сваю назіральнасць і ўменне майстраваць — за хвіліну патрабавалася зрабіць папяровую шапку. Пасля гэтага іх зноў чакала геаграфічнае заданне: па намацаным контуры неабходна было вызначыць, што гэта за кантынент ці частка свету ў мяшку, а потым і праспяваць песню, дзе была б любая геаграфічная назва ці, наогул, радкі, звязаныя з геаграфіяй. Але і гэты пікет быў не апошнім. На наступных заставах патрэбна было называць імёны і імёны па бацьку выкладчыкаў (дарэчы даволі многія тут "зрэзаліся", хоць пытанні датычыліся выкладчыкаў, якія працуюць на першым курсе), мець справу з мінімумам геаграфічных назваў, з завязанымі вачыма на слых наліць вады ў стакан паміж вызначанымі ўзроўнямі, з трох спроб трапіць дроцікам у ксеракопію фотаздымка намесніка дэкана па вучэбнай і выхаваўчай рабоце М.В. Кухарчыка, які актыўна дапамагаў парадамі ўдзельнікам конкурсу. У яго я і спытаў пра партрэт сённяшняга першакурсніка:

"Гэта добрыя дзеці і студэнты. Але можна было б яшчэ лепшых набраць... У наступныя гадоў пяць. Ну а сёння мы іх пакуль што "апячаталі". А на занятках мне даводзіцца сустракацца як з даволі моцнымі хлопцамі і дзяўчатамі, так і з тымі, хто пасля паступлення ў БДУ перастаў, на жаль, вучыцца".

Ну а напрыканцы паласы перашкод яе ўдзельнікаў сустракаў старшыня прафбюро факультэта Вадзім Грышчанка, які ставіў пячатку аб праходжанні выпрабаванняў у "залікоўку" і на твар першакурснікаў. Яму таксама было зададзена пытанне: "Як выглядае сённяшні першакурснік?"

"Вось гэта і ёсць партрэт сённяшняга першакурсніка, — адказаў ён, прафесійна паставіўшы дзве пячаткі на твар чарговага студэнта. — Гэта малады чалавек, вышэйшы за сярэдняга... трэцякурсніка, на першы погляд, з развітым пачуццём гумару, які разумее і цэніць яго".

Зразумела, пацікавіўся я аб уражаннях і ў саміх першакурснікаў. Настрой пасля выпрабаванняў быў прыўзняты. Таму і адказы былі наступныя:

Ніна Кульбеда: "Вельмі спадабалася. Больш за ўсё — апошні конкурс, а таксама тыя, дзе патрэбна было спяваць песні". Жэня Краснянскі, Сяргей Куклоў — героі паласы, адны з тых, хто атрымаў плюсы ва ўсіх конкурсах: "Усё вельмі выдатна. Найбольшыя цяжкасці выклікаў конкурс з вадой і стаканам, а самым лёгкім для нас быў пад'ём па "геаграфічнай" лесвіцы". Наталля Струг, Марыя Карпічэнка: "Нам спадабалася ўсё. Вадой не аблівалі, мукой не абсыпалі. А пасля сённяшняга землязнаўства геаграфічныя пытанні цяжкасцяў наогул не выклікалі".

Ну а пасля таго, як апошні з удзельнікаў прайшоў праз "апячатванне", былі падведзены вынікі паласы. І ўсе, хто прайшоў яе на адны плюсы, атрымалі прызы.

Была прадстаўлена і культурная праграма. Тут таксама актыўны ўдзел прынялі ўжо заліч́аныя ў шэраг студэнтаў першакурснікі. Кожная навучальная група прадстаўляла свой канцэртны нумар. Нумары гэтыя адрозніваліся адзін ад аднаго новымі ідэямі, рэжысёрскімі знаходкамі, а акцёры стараліся з усяе сілы, каб як мага лепей выканаць сваю ролю, каб спадабацца гледачу. Для гэтага выкарыстоўваўся вельмі шырокі арсенал: пераапрананні, бардаўскія песні, папуры на вядомыя шлягеры, нават свая інтэрпрэтацыя вершаў А.С. Пушкіна. Але найбольш парадавала гледачоў добра вядомая казка пра рэпку, разыграная па ролях. Удзельнікі не выбіраліся з ліку гледачоў і пры ўзгадванні свайго героя гаварылі адну, прапанаваную аўтарам фразу. А калі ўлічыць, што паўтарыць яе патрэбна было на розныя лады, то тут адкрываўся неабсяжны прастор для фантазій. І ўсе імкнуліся зрабіць гэта як мага лепш. Аднак, калі вядомая ўсяму факультэту "рэпка" (М.В. Кухарчык) не вытрымала і да стандартнага ўжо "оба-на" дабавіла "задралі!", апладысменты не сціхалі амаль хвіліну, а аўтары-пастаноўшчыкі патрабавалі потым адказваць толькі такім чынам.

Акрамя таго, удзел у святе прыняла і геафакаўская каманда КВЗ. Упершыню заявілі яны пра сябе на мінулагоднім факультэцкім матчы каманд КВЗ 1-га і 2-га курсаў, прымеркаваным да дня студэнта. А сёння ўжо ў рангу асноўнай каманды яны прадстаўляюць факультэт на універсітэцкай арэне. Таму і іх выступленне адрознівалася ўжо сталым прафесіяналізмам, хоць быў у ім і сапраўдны задор, з якім упершыню выходзяць на сцэну. Яны выканалі сола-шумавы гімн геафака, не абмінулі праблемы інтэрната (сапраўды, амаль тры тыдні без святла немагчыма забыць, тым больш, што цяпер былыя цяжкасці выклікаюць толькі ўсмешкі), падрыхтавалі падборку сусветных навін. А некалькі перапрацовак хітоў гурта "Іванушкі international" не толькі павесялілі гледачоў, але і нагадалі аб сапраўднай практыцы першага курса.

Напрыканцы вечарыны адбылася традыцыйная дыскатэка.

*Вадзім ЗУБРЫЦКІ,*
*інфармацыйны сектар маладзёжных арганізацый геафака*

ЯК ЖЫВЕШ, ІНТЭРНАТ?

# Хэлоуін, альбо нячысцікі ў інтэрнаце

Кожны год, з 31 кастрычніка на 1 лістапада, у Дзень усіх святых (згодна з паданнем, у гэты дзень на зямлю сыходзіць уся нячыстая сіла) святкуецца баль-маскарад, які называецца Хэлоуін. Гэта адно са старажытнейшых святаў у свеце. У гэтым дзіўным свяце перапляліся кельцкая традыцыя ўшаноўвання злых духаў і хрысціянская — пакланення ўсім святым.

1 кастрычніка ў інтэрнаце № 7 з гэтай нагоды адбылася дыскатэка, у якой прымалі ўдзел самі жыхары і шматлікія госці. Штогод студэнты з нецярпеннем чакаюць гэтага свята, рыхтуюцца да яго, робяць сабе касцюмы. Так было і на гэты раз. Кожны, хто заходзіў у залу, адчуваў сябе так, нібы трапіў на незвычайны казачны востраў: тут былі і піраты, і русалкі, і вадзянікі, і анёлы, героі шматлікіх казак. З дарослых і сур'ёзных студэнты ў момант ператвараліся ў гарэзлівых і бестурботных дзяцей. Усе праблемы, клопаты паўсядзённага жыцця саступілі месца смеху, радасці, весялосці, жартам.

На жаль, не ўсе разумеюць старажытны сэнс гэтага свята. Хэлоуін інтрыгуе загадкавасцю, сваёй міфічнай значымасцю. Гэтае свята — спроба зразумець сувязь паміж рэальным і незямным светамі. Хэлоуін — гэта пераход з аднаго свету ў другі. Гэта час, калі чалавек можа ўсвядоміць сваё месца ў павуціне вечнасці.

Лепшыя касцюмы былі адзначаны ганаровымі месцамі. Ужо другі год першае месца атрымліваюць жыхары 4-га паверха Таццяна Грыцкевіч, Ганна Малмыга, Зарына Жамойціна, Марына Бойка за касцюм "Падводнае царства". Другое месца атрымала Аксана Мерзлякова (13-ты паверх) за касцюм "Карлсан", а на трэцім месцы з касцюмам "Піраты" — жыхары 9-га паверха.

Свята ўдалося на славу. Студэнты добра адпачылі, прадэманстравалі ўсю сваю фантазію і здольнасці. Застаецца толькі пажадаць, каб падобныя мерапрыемствы адбываліся часцей.

*Наталля БАБРУК,*
*студэнтка філалагічнага факультэта*

СЛУЖБА 02

# Лёгкая здабыча

У сакавіку 1999 года студэнты 3-га і 4-га курсаў БДУ, папярэдне змовіўшыся, прабраліся ў пакой свайго таварыша і скралі мікрахвалевую печку. Аднак скарыстацца "лёгкай здабычай" яны не паспелі дзякуючы ўмелым дзеянням супрацоўнікаў міліцыі.

За зробленае злачынства суд прысудзіў студэнтаў да пакарання ў выглядзе трох гадоў пазбаўлення волі ўмоўна. На гэты раз маладыя злачынцы займелі толькі лёгкі спалох, але гэта паслужыць ім урокам на ўсё жыццё.

*В. МАЛЫШКА,*
*супрацоўнік Маскоўскага РУУС*

*Сетка Інтэрнэт усё часцей выкарыстоўваецца ў адукацыйных мэтах, прычым найбольш актыўна ў краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі. У Беларусі таксама ўсё больш прыходзяць да ўсведамлення неабходнасці выкарыстання Інтэрнэт для навучання. І не толькі, каб адшукаць неабходную інфармацыю на пэўную тэму, але і каб удзельнічаць у адкрытых праектах дыстанцыйнага навучання.*

*Па просьбе рэдакцыі газеты "Беларускі універсітэт" кафедра эканамічнай інфарматыкі эканамічнага факультэта БДУ надрыхтавала серыю артыкулаў: інфармацыйныя рэсурсы Інтэрнэт для эканамістаў, юрыстаў, матэматыкаў, журналістаў і т.п. Дадзены артыкул распачынае гэтую серыю.*

# РЭСУРСЫ ІНТЭРНЭТ

У глабальнай сетцы Інтэрнэт сёння існуе вялікая колькасць разнастайнай інфармацыі, у тым ліку і па эканамічнай тэматыцы. Разабрацца ў гэтым не так проста. Таму ўзнікае неабходнасць у сістэматызацыі і класіфікацыі існуючых Інтэрнэт рэсурсаў для эканамістаў (навукоўцаў, студэнтаў, бізнесменаў, урадавых аналітыкаў). Прадстаўленая ніжэй падборка рэсурсаў для эканамістаў з'яўляецца спробай сістэматызацыі той інфармацыі эканамічнага зместу, якая ёсць у Інтэрнэт на сучасны момант. Варта адзначыць, што дадзены спіс не ахоплівае абсалютна ўсе рэсурсы ў галіне эканомікі. Тут не закрануты вялікі аб'ём фінансавай і дзелавой інфармацыі аб біржах і банках свету (такую інфармацыю можна знайсці ў артыкуле М.М. Кавалёва, Т.В. Свірыд "Інфармацыйныя паслугі для банкаў", які быў надрукаваны ў "Вестнике Ассоциации белорусских банков", № 35 ад 17 верасня 1999 года). Тут прадстаўлены толькі тыя спасылкі, якія змяшчаюць па магчымасці найбольш абагуленыя рэсурсы ў сферы адукацыі, навуковых даследаванняў і распрацовак ў галіне эканомікі. Такі падыход быў абраны для таго, каб спрасціць пошук неабходнай эканамічнай інфармацыі.

Усе рэсурсы змяшчаюць сціслую характарыстыку, якая дае найбольш агульнае ўяўленне пра тое, што можна знайсці на сайце. Неабходна адзначыць, што з-за таго, што ў краінах СНД Інтэрнэт існуе не так даўно, найбольшую інфармацыйную прастору ў сетцы займаюць міжнародныя рэсурсы. Таму ўсе прадстаўленыя ніжэй рэсурсы з'яўляюцца міжнароднымі, гэта значыць, што інфармацыя на сайтах даступна ў асноўным на англійскай мове, хаця сустракаюцца і старонкі на рускай мове.

Неабходную эканамічную інфармацыю можна знайсці з дапамогай розных пошукавых сістэм, такіх як:

**AltaVista** — *http://www.altavista.com,*
**HotBot** — *http://www.hotbot.com,*
**InfoSeek** — *http://www.infoseek.com,*
**Looksmart** — *http://www.looksmart.com,*
**Lycos** — *http://www.lycos.com.*

**Yahoo** — эканамічная старонка ў пошукавай сістэме Yahoo знаходзіцца па адрасе — *http://www.yahoo.com/Social_Science/Economics/.*

Эканамічную інфармацыю таксама можна знайсці пры дапамозе пошукавай сітэмы **Magellan** — *http://www.mckinley.com/magellan/.*

Акрамя таго, існуюць спецыяльныя пошукавыя сістэмы для эканамістаў. Пошукавая сістэма **Inomics** — *http://www.inomics.com/query/search* займаецца пошукам толькі эканамічнай інфармацыі. Вы можаце абмежаваць свой пошук асобнымі секцыямі: эканамічныя аддзяленні універсітэтаў, інстытуты і ўрады, іншая эканамічная інфармацыя, дыскусіі. Можна выкарыстоўваць пашыраны пошук.

Спецыяльныя рэсурсы для эканамістаў у сетцы Інтэрнэт могуць быць падзелены на некалькі груп:

— рэсурсы ў галіне эканомікі, сабраныя, як правіла, альбо прыватнымі асобамі, альбо кампаніямі ці іншымі арганізацыямі;

— рэсурсы, сабраныя і прадстаўленыя універсітэтамі, што з'яўляецца даволі распаўсюджанай практыкай у краінах Заходняй Еўропы і Амерыкі;

— рэсурсы, прадстаўленыя міжнароднымі эканамічнымі арганізацыямі;

— эканамічная інфармацыя і рэсурсы, якія прадстаўляюць сродкі масавай інфармацыі і агенцтвы навін у рэжыме on-line.

Крытэрыем для такога падзелу выступае крыніца рэсурсаў, г. зн. кім сабраны, упарадкаваны і прадстаўлены рэсурсы.

Звернемся да першага блока рэсурсаў.

http://sosig.esrc.bris.ac.uk/subject-guides/economics.html#8

Другая старонка *http://sosig.esrc.bris.ac.uk/roads/subject-listing/World-cat/econ.html* змяшчае вялікую колькасць анатаваных спасылак для эканамістаў, разбітых на вялікія блокі:
— артыкулы і навуковыя працы;
— бібліяграфічныя даныя;
— кнігі;
— кампаніі;
— крыніцы даных;
— адукацыйныя матэрыялы;
— урадавыя агенцтвы;
— часопісы;
— навіны;
— арганізацыі і таварыствы;
— даследчыя цэнтры;
— спіс рэсурсаў для эканамістаў.

**Каталог матэрыялаў па эканоміцы** — *http://www.helsinki.fi/WebEc/* змяшчае эканамічную інфармацыю па накірунках:
— эканоміка і адукацыя;
— метадалогія і гісторыя эканамічнай думкі;
— матэматычныя і колькасныя метады;
— эканоміка і вылічальная тэхніка;
— эканамічныя дадзеныя;
— макраэканоміка;
— мікраэканоміка;
— міжнародная эканоміка;
— фінансавая эканоміка;
— эканамічныя сістэмы;
— бібліятэкі;
— інстытуты;
— сацыяльныя навукі і інш.

**Рэсурсы для эканамістаў Біла Гофа** — *http://www.rfe.org* змяшчае спасылкі на эканамічныя сайты, статыстычныя і эканамічныя даныя па ЗША і ўсяму свету, крыніцы фінансавай інфармацыі, даныя эканамічнага прагназавання, рабочых дакументаў і публікацый, у тым ліку акадэмічных, крыніцы інфармацыі пра канферэнцыі, эканамічныя часопісы і газеты ў Інтэрнэт, эканамічныя таварыствы і асацыяцыі, навукова-даследчыя і акадэмічныя таварыствы, універсітэты, каледжы, бізнес-школы, бібліятэкі, вакансіі для эканамістаў, эканамічнае, статыстычнае і іншае праграмнае забеспячэнне і г.д.

**Эканамічная сетка доктара Ярдзені** — *http://www.yardeni.com/yardeni/* утрымлівае інфармацыю аб эканамічных індыкатарах, штотыднёвы эканамічны аналіз, інфармацыю аб грашовых і банкаўскіх сістэмах, фіскальную палітыку і глабальную эканоміку. На сайце таксама змяшчоцца фінансавыя і эканамічныя дыяграмы, апошнія фінансавыя і дзелавыя індыкатары, тэндэнцыі, аналізы і прагнозы, пошук у архіве, спасылкі на іншыя універсітэты, урады і выданні, а таксама на іншыя каталогі ў Інтэрнэт.

**WWW прадметны каталог** — *http://bubl.ac.uk/link/subjects/* прадстаўляе спасылкі ў галіне эканомікі — *http://link.bubl.ac.uk/economics/*, сабраныя інфармацыйнай службай BUBL (*http://bubl.ac.uk/*).

**Спіс эканамічных рэсурсаў** — *http://www.clark.net/pub/lschank/web/econ.html*, прадстаўленых Лэры Шэнкмэнам.

**Каталог інфармацыі ў сферы сацыяльных навук** (Social Science Information Gateway — SOSIG) — *http://sosig.esrc.bris.ac.uk/* змяшчае Інтэрнэт рэсурсы аб адукацыі і даследаваннях у сферы сацыяльных навук. Яго эканамічная секцыя ўключае вялікую колькасць спасылак на рэсурсы для эканамістаў у сетцы Інтэрнэт.

Сайт **Камунікацыя для ўстойлівага будучага развіцця** (CSF) — *http://csf.colorado.edu/* змяшчае наступныя катэгорыі: экалогія і навакольнае асяроддзе, адукацыя і навучанне, гетэрадаксальная эканоміка, міжнародныя даследаванні.

WWW **Віртуальная бібліятэка: сацыяльныя навукі** — *http://www.clas.ufl.edu/users/gthursby/socsci/* прадстаўляе інфармацыю ў рэжыме on-line як частку сусветнай віртуальнай бібліятэкі. Праведзена ацэнка сайтаў на адпаведнасць інфармацыйных рэсурсаў, якія яны прадстаўляюць.

**AmosWorld** - *http://amos.bus.okstate.edu/* — вядучы сайт, які забяспечвае адукацыйную эканамічную інфармацыю. Сайт уключае таксама энцыклапедычны слоўнік AmosWorld.

**Энцыклапедыя Брытаніка** (*http://www.britannica.com/*) прадстаўляе ў сетцы інфармацыю пра web рэсурсы ў сферы эканомікі — *http://www.eblast.com/browse.html?OPATH=927&HeadingUid=7970.* Прадметныя катэгорыі ўключаюць адукацыю, навучанне і даследаванні, гісторыю эканамічнай думкі, эканамічныя даныя і індыкатары, інфармацыю аб эканамістах, урадавых установах, арганізацыі і публікацыі.

**Матэрыялы па фінансавых аспектах у эканоміцы** — *http://galaxy.tradewave.com/galaxy/Social-Sciences/Business-Administration/Financial-Aspects/Economics.html* уключаюць сістэматызаваныя спасылкі на дзяржаўныя, акадэмічныя і некамерцыйныя арганізацыі, перыядычныя выданні і іншыя крыніцы інфармацыі.

**FINWeb** — *http://www.finweb.com/* — рэсурсы сеткі Інтэрнэт на эканамічныя і фінансавыя тэмы, таксама прадстаўляе доступ да эканамічных часопісаў у электронным выглядзе.

**Бізнес адукацыя ў Інтэрнэт** (BizEd Net) — *http://bized.ac.uk/* бясплатная інфармацыйная служба, якая звязвае сутдэнтаў, выкладчыкаў, прамысловых і інфармацыйных правайдэраў. Сайт змяшчае дастаткова пашыраную базу даных па эканамічных рэсурсах.

Інфармацыю **аб эканамістах, якія атрымалі Нобелеўскую прэмію**, можна знайсці на сайце — *http://www.almaz.com/nobel/economics/* альбо ў Інтэрнэт-архіве аб нобелеўскіх лаўрэатах - *http://www.almaz.com/nobel/nobel.htm.*

Другі вялікі блок рэсурсаў для эканамістаў уключае тыя рэсурсы, якія былі сабраны і размешчаны на сайтах універсітэтаў, у асноўным амерыканскіх альбо заходнееўрапейскіх.

# ДЛЯ ЭКАНАМІСТАЎ

**Эканамічныя і статыстычныя рэсурсы Інтэрнэта** — *http://www.lib.lsu.edu/bus/economic.html* змяшчаюць спасылкі ў асноўным на амерыканскія крыніцы, сабраныя ва універсітэце Луізіяны.

**Эканамічныя крыніцы** — *http://sun3.lib.uci.edu/~dtsang/econ.htm* — сайт Каліфарнійскага універсітэта змяшчае даныя універсітэтаў, часопісаў і іншыя публікацыі, інфармацыю аб прафсаюзах, спасылкі на базы даных і г.д.

**ECONlinks** (эканамічныя спасылкі) — *http://www.ncat.edu/~simkinss/econlinks.html* распрацаваны прафесарам Паўночнай Караліны (*http://www.ncat.edu/~econdept/*) Скотам Сімкінсам, каб прадаставіць доступ да асноўнай эканамічнай і фінансавай інфармацыі ў сетцы Інтэрнэт студэнтам, якія вывучаюць эканоміку і бізнес.

**Даклад аб развіцці бізнеса і эканомікі** (Scout Report for Business and Economics) — *http://scout.cs.wisc.edu/report/bus-econ/current/index.html* быў распрацаваны ва універсітэце Вісканісіна для студэнтаў, супрацоўнікаў эканамічных факультэтаў, бібліятэкараў, якія працуюць з эканамічнай і дзелавой літаратурай. Кожнае выданне, якое выходзіць два разы на тыдзень, прапануе выбраную калекцыю Інтэрнэт рэсурсаў у сферы эканомікі і іншую эканамічную інфармацыю.

**Універсітэт Рутгерса**, Нью-Брансуік - *http://www.rutgers.edu* — прадстаўляе некалькі падборак рэсурсаў для эканамістаў у сетцы Інтэрнэт:

эканамічны альбом *http://www.libraries.rutgers.edu/rul/rr_gateway/research_guides/econ/escrap.html* — каталог і даведнік па эканамічных рэсурсах і эканамічных рэсурсы — *http://www.libraries. rutgers.edu/rul/rr_gateway/research_guides/econ/econ.shtml*, якія змяшчаюць мноства класіфікаваных даных у сферы эканомікі.

**Web старонкі па эканамічных тэмах** — *http://ideas.uqam.ca/QMRBC/others.html* Крысціана Цымермана (Квебекскі універсітэт у Манрэалі — *http://ideas.uqam.ca/*). Разбіўка прадстаўлена па асобных эканамічных тэмах, такіх як эканамічная гісторыя, эканаметрыка, міжнародная эканоміка і г.д.

Акрамя таго, на сайце Квебекскага універсітэта выкарыстоўваецца заходняя сістэма класіфікацыі эканамічнай літаратуры (*http://ideas. uqam.ca/ideas/data/JEL/*):

A — агульная эканамічная тэорыя і выкладанне (General Economics and Teaching);

B — метадалогія і гісторыя эканамічнай думкі (Methodology and History of Economics Thought);

C — матэматычныя і колькасныя метады ў эканоміцы (Mathematical and Quantitative Methods);

D — мікраэканоміка (Microeconomics)

E — макраэканоміка і эканоміка грашова-крэдытнай сферы (Macroeconomics and Monetary Economics);

F — сусветная эканоміка (International Economics);

G — фінансавая эканоміка (Financial Economics);

H — эканоміка грамадскага сектара (Public Economics);

I — ахова здароўя, адукацыя і дабрабыт (Health, Education, and Welfare);

J — эканоміка працы і народанасельніцтва (Labor and Demographic Economics);

K — права і эканоміка (Law and Economics);

L — арганізацыя прамысловасці (Industrial Organization);

M — кіраванне камерцыйнай дзейнасцю і бізнес, маркетынг, бухгалтарскі ўлік (Business Administration and Business Economics; Marketing; Accounting);

N — эканамічная гісторыя (Economic History);

O — эканамічнае развіццё, тэхналагічныя змены і рост (Economic Development, Technological Change, and Growth);

P — эканамічныя сістэмы (Economic Systems);

Q — эканоміка сельскай гаспадаркі і прыродных рэсурсаў (Agricultural and Natural Resource Economics);

R — эканоміка горада, сельскай мясцовасці і рэгіёна (Urban, Rural, and Regional Economics);

Z — іншыя спецыяльныя тэмы (Other Special Topics);

**Бібліятэка Каліфарнійскага універсітэта** (*http://www.library.ucsb.edu/*) уключае эканамічную і бізнес секцыю — *http://www.library.ucsb.edu/economic.html*, якая змяшчае інфармацыю аб грашовай і банкаўскай сферы, сектары грамадскіх фінансаў і налогаабкладанні, крыніцах даных па эканоміцы, вялікіх па аб'ёме эканамічных сайтах, эканамічнай літаратуры, бібліятэках і інш.

**Эканамічныя спасылкі** — *http://www.unizh.ch/sts/links/links.html*, сабраныя Вольфрамам Струвэ і Клаўдыа Мазоні, змяшчаюць наступныя раздзелы: агульныя рэсурсы, бібліятэкі, даследчыя матэрыялы ў галіне эканомікі, часопісы, эканамічныя паслугі, базы даных, эканамічныя супольніцтвы і асацыяцыі, міжнародныя арганізацыі, праграмнае забеспячэнне, іншыя Інтэрнэт рэсурсы ў галіне эканомікі. Старонка знаходзіцца на сайце эканамічнага факультэта універсітэта Цюрыха — *http://www.unizh.ch/sts/*.

**Бібліятэка бізнес школы ў Нідэрландах** змяшчае інфармацыю аб Інтэрнэт рэсурсах у галіне эканомікі — *http://www.library.nijenrode.nl/nbr/200/200-240.html*.

Сайт вядомага **Каліфарнійскага універсітэта Берклі** — *http://www.sims.berkeley.edu* прадстаўляе спасылкі на некаторыя рэсурсы для эканамістаў у сетцы Інтэрнэт.

На сайце *http://www.rz.uni-karlsruhe.de* прадстаўлена інфармацыя на нямецкай мове аб **эканамічных даследаваннях у Германіі.**

Трэці блок эканамічных рэсурсаў — эканамічная інфармацыя, прадстаўленая міжнароднымі эканамічнымі арганізацыямі. Сайты самых буйных:

Пры **Арганізацыі Аб'яднаных Нацый** (ААН) — *http://www.un.org* — існуе цэнтр па развіцці гандлю — ЮНКТАД (United Nations conference on trade and development) — *http://www.unctad.org*.

**Сусветны банк** — *http://www.worldbank.org* прадстаўляе на сваім сайце разнастайную эканамічную інфармацыю, такую як сацыяльныя паказчыкі развіцця (*http://www.ciesin.org/IC/wbank/sid-home.html*), эканамічныя тэндэнцыі краін, якія развіваюцца (*http://www.ciesin.org/IC/wbank/tde-home.html*), сусветныя эканамічныя табліцы (*http://www.ciesin.org/IC/wbank/wtables.html*) і інш.

Эканамічны агляд Сусветнага банка — *http://www.worldbank.org/html/extpb/review/reviewco.htm*

**Міжнародная Фінансавая Карпарацыя** (МФК) — *http://www.ifc.org*.

**Міжнародны Валютны Фонд** (МВФ) — *http://www.imf.org/*. Таксама як і Сусветны банк, МВФ прадстаўляе вялікую колькасць эканамічнай інфармацыі, справаздач, табліц і іншыя даныя.

**Сусветная Гандлёвая Арганізацыя** (СГА) — *http://www.wto.org*.

**Міжнародная гандлёвая палата** — *http://www.iccwbo.org*.

**Паўднёваамерыканскі эканамічны саюз** (NAFTA) — *http://www.sice.oas.org/trade/nafta/naftatce.htm*.

**Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця** — *http://www.oecd.org/*.

Інфармацыю аб працоўных рэсурсах і рынках працы можна знайсці на сайце **Міжнароднай Арганізацыі Працы** (МАП) — *http://www.ilo.org*.

**Еўрапейскі Саюз** — *http://europa.eu.int*.

Вялікі спіс эканамічных арганізацый усяго свету можна знайсці на старонцы — *http://www.uia.org/webints/websw47.htm*.

Акрамя таго, інфармацыю эканамічнага характару можна знайсці ў эканамічных часопісах і газетах, многія з якіх маюць свае сайты і бясплатна прадстаўляюць вялікую колькасць інфармацыі ў рэжыме on-line.

**Спіс эканамічных часопісаў** — *http://www.helsinki.fi/WebEc/journals.html*.

**Эканамічныя часопісы ў сетцы Інтэрнэт** — *http://www.oswego.edu/~economic/journals.htm*.

**Спіс вядучых часопісаў у галіне сацыяльных навук у электронным выглядзе** — *http://www.clas.ufl.edu/users/gthursby/socsci/ejournal.htm*.

**Спіс газет свету on-line** — *http://www.intercom.com.au/intercom/newsprs/*.

**AJR Newslink** — *http://www. newslink.org/news.html* прадстаўляе вялікі спіс спасылак на газеты.

**Atlantic Monthly** — *http://www.theatlantic.com/issues/current/* прадстаўляе разнастайную калекцыю артыкулаў па эканоміцы.

Агляды апошніх эканамічных артыкулаў, надрукаваных у вядучых часопісах — *http://economics. miningco. com/library/weekly/blMags.htm*.

Некаторыя найбольш вядомыя друкаваныя выданні сусветнага маштабу, якія маюць свае сайты:

**Эканаміст** — *http://www.economist.com/*. Вядомы брытанскі часопіс прадстаўляе некаторыя артыкулы бягучага нумара на сваёй хатняй старонцы.

**Wall Street Journal** — *http://update.wsj.com/* некаторая інфармацыя прадстаўляецца бясплатна.

**Finansial Times** — *http://www.ft.com*.

**Пра эканамічныя навіны** можна даведацца, калі звярнуцца на наступныя сайты:

Сусветныя навіны — *http://www.worldwide-news. com/*.

Штодзённыя навіны ў сетцы Інтэрнэт — *http://www.rhythm.com/~prash/inc/biz.shtml* — дзелавыя навіны, якія пастаянна абнаўляюцца, а таксама спасылкі на іншыя серверы, якія прапануюць навіны са сферы бізнесу.

Навіны ад Reuters, якія прадстаўляюцца ў рэжыме on-line праз пошукавую сістэму Yahoo — *http://www.yahoo.com/headlines/*.

Навіны BBC / Эканоміка — *http://news.bbc.co.uk/hi/english/business/the_economy/*.

Навіны CNN — *http://cnnfn.com/news*.

Навіны ад Washington Times - *http://www.artigen.com/newswire/*.

*Святлана БАТРАКОВА, студэнтка 5-га курса эканамічнага факультэта БДУ*

У КАМЕННЫМ ЦАРСТВЕ

# Сімвал надзеі

У вандроўцы па музеі землязнаўства нельга не затрымацца каля вітрыны каштоўных камянёў. Хочацца зноў зазірнуць у таемнае царства зямных нетраў і падзяліцца ўражаннямі з шаноўнымі чытачамі "Беларускага універсітэта".



Пры першым знаёмстве з каменным царствам нішто так не ўразіла мяне, як апал. Я ўбачыла ў ім сонечнае ззянне, месяцовыя водбліскі, казачна прыгожае рознакаляровае свята прыроды.

А пазней я пазнаёмілася з цэлай калекцыяй апалаў на Міжнароднай выставе ў Варшаве, якую прывезлі з Вены, і тады апалы сталі для мяне найцудоўнейшымі прыроднымі ўтварэннямі. Я не магла адысціся ад вітрын. На нейкі момант падалося, што я трапіла ў цудоўную касмічную казку, дзе навокал зіхацела рознакаляровае святло. Я нават дыханне затойвала: здавалася, што ўздыхнеш глыбока — і знікне гэтая прыгажосць. Апалы там былі пераважна з Аўстрыі і Венгрыі.

Праз некаторы час пашчасціла пабываць на мінералагічнай выставе ў Маскве, дзе выстаўляліся сінтэтычныя апалы. Яны былі прыгожа аздобленыя, але пры іх выглядзе станавілася неяк сумна, не адчувалася той цеплыні і пяшчоты, якую выпраменьвалі прыродныя камяні. Першыя сінтэтычныя апалы атрымалі ў 1964 годзе. Адрозніць ад прыродных іх вельмі лёгка: яны маюць меншую цвёрдасць і, нібы магніт, прыліпаюць да языка.

У музеі землязнаўства БДУ ёсць тры каштоўныя апалы з Венгрыі, вогненны апал і махавыя — з Казахстана, каля дзесяці ўральскіх узораў.

Што ж гэта за камень, які лічыцца шчаслівым каменем кастрычніка? Апал — мінерал вокіслу крэмнію, па сваім складзе блізкі да кварца. Спецыялісты вызначаюць больш за 130 відаў апалаў. Асабліва прывабны — чорны з цудоўным малінавым ззяннем. Ён быў высока ацэнены яшчэ ў Старажытнай Грэцыі і Рыме. Дастаткова сказаць, што рымскі імператар Ноній нават пайшоў у ссылку, але не аддаў свой улюбёны апалавы пярсцёнак усемагутнаму палкаводцу Марку Антонію, якому ён так прыйшоўся даспадобы.

Сустракаюцца і невысакародныя (простыя) апалы. Белы парцалянападобны апал называецца кахалонгам, пяшчотна-зялёны — празапалам, а шклопадобны і светлай афарбоўкі — гіялітам.



Апал складае многія горныя пароды: гейзерыт, ці крэмністы туф, у якім апал адкладаўся з гарачых крыніц і гейзераў; дыятаміт, трэпел, апока... Гэтыя камяні (у большасці дыятаміт) выкарыстоўваюць у якасці мяккага абразіва, напаўняльніка, фільтруючага, ізаляцыйнага і гуканепранікальнага рэчыва. А яшчэ — для вытворчасці керамікі і вогнетрывалай цэглы.

Незвычайнасць апалу тлумачыцца тым, што вада ў ім складае ад некалькіх працэнтаў да адной траціны ўсёй масы. Каб зберагчы прыгажосць самацвета, яго трэба час ад часу акунаць у чыстую ваду. Да таго ж варта памятаць, што гэты камень не любіць перагрэву (гэтую якасць улічваюць ювеліры пры апрацоўцы).

Словам, надта ж ён капрызны, аднак паддаецца лячэнню. Засцярога ад хваробы, як ужо сказана вышэй, — водныя працэдуры. У Венгрыі навучыліся лекаваць яго ў спецыяльных вакуумных камерах, і пасля насычэння вадой да апалу вяртаецца яго цудоўнае ззянне.

Дарэчы, сама назва "апал" паходзіць ад санскрыцкага "ўпала", што азначае — каштоўны камень. Зараз гэты камень цэніцца высока, але так было не заўжды. У яго дзіўны лёс, ён зведаў узлёты і падзенні. На шыкоўным балі ззяючых каштоўных мінералаў ён то трапляе ў цэнтр агульнага захаплення, то адыходзіць у цень. Чаму так? Таму, што яго неверагодная прыгажосць, шматколернасць не толькі здзіўляюць і прывабліваюць, але і палохаюць. Такія ўжо ў апалу прыродныя ўласцівасці.

Прамысловыя радовішчы высакародных апалаў вядомыя ў Чэхіі, Славакіі, Мексіцы, Гандурасе, Бразіліі, ЗША. Унікальнымі лічацца радовішчы Аўстраліі, якія даюць 80-90 % усёй сусветнай здабычы. Распрацоўка іх вядзецца з 1877 года. У Расіі апалы сустракаюцца на Камчатцы, Чукотцы. Ёсць яны і на Украіне, і на Каўказе. Прываблівалюць сваёй прыгажосцю апалы Казахстана — яны маюць аранжава-чырвоныя, вішнёва-чырвоныя і бурштынава-жоўтыя колеры.



Апошнім часам попыт на апалы, асабліва чорныя, значна ўзрос, таму і цэны на сусветным рынку на гэты камень высокія (вышэй за 500 долараў за карат). Апрацоўваюць апалы ў форме кабашона. Самыя прыгожыя камяні знаходзяцца ў найлепшай калекцыі апалаў у Вене. Прыгадаем толькі адзін з іх — яго вага дасягае 7 тысяч каратаў...

Гэты чароўны і непаўторны камень самой прыродай прызначаны натхняць сваімі цудоўнымі фарбамі і гульнёй колераў фантазію паэтаў, пісьменнікаў і іншых творчых асобаў. Нездарма ж менавіта апал з'яўляецца сімвалам надзеі.

*Валянціна СМАЛЯКОВА, геолаг музея землязнаўства БДУ*


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Заснавальнік газеты — БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Газета надрукавана ў Выдавецкім цэнтры Белдзяржуніверсітэта 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6. Ум. друк. арк. 1*

*Падпісана да друку ў 12.00*

*11 лістапада. Зак. 773. Т. 1000 экз.*

*Адрас рэдакцыі: 220080, Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 2206827.*

**Рэдактар Т. М. КАЗАК**

*Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР*

*Камп'ютэрная вёрстка Вольгі Сырыч*